Пакуль што мне нічога ня трэба. Летам буду хадзіць босы, нажывацьму тоўстую скуру на нагах. Будзе і здаравей, і лепей.

З кніжак прышлі хіба Гётэ першы том. Рэмарка я прачытаў ужо ўсяго і пераклаў большую палову. Усё–ж ён мяне ня зусім здавальняе. Яго перахвальвалі і пратрубілі пра яго залішне і не па заслугах, так лічу я. Ёсьць слаўныя малюнкі, але няма, як кажуць, душы ўва ўсёй кам[п]азыцыі гэтых малюнкаў, няма ідэі, што цэмэнтавала–б іх у адзінае цэльнае палатно поэтычнага мастацтва. Рассыпчатыя яны і не паказваюць шляху да барацьбы са злом вайны, ня кажуць выхаду з гэтага зла.

Прышлі, любая, таксама вялікі слоўнік (нямецка–рускі). Хачу пачытаць Гётэ і на ім удасканаліць свае веды мовы.

Як атрымаеш гэты ліст да 14, то любая, прынясі мне ў гэту перадачу туфлі, прасьціню і ручнік. Таксама прышлі зубнога парашку. Моцна–моцна цалую цябе, любая Анечка, сваіх слаўных дзетак Лорачку і Лялячку і маму.

Ваш *Адам*.

Анечка, ці зьняла ты нашых дзетак? Калі не, пастарайся зьняць іх, а таксама зьніміся і сама з імі.

Напішы, любая, як маміна нага, ці загаілася яна? Ці памагло тады, як вазіў я яе ў амбуляторыю?

## № 43. Ганьне Бабарэцы

*14/IV–1931*

Дарагая любая мая Анечка!

Адсылаю пару бялізны, прасьціню, ручнікі 3, пару шкарпэтак, хустачку, торбу, наўлачку, каструлю, бутэльку і чаравікі. Чаравікі трэба правіць.

Любая, прасі спатканьня абавязкова.

Я здароў. Шчыра дзякую Вам усім за сёньнешнюю перадачу.

Моцна–моцна цалую Вас усіх.

Прыгатуй мне, любая, на дарогу сёе–тое з харчоў.

Цалую вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 44. Ганьне Бабарэцы

*21/IV–1931*

Дарагая любая мая Анечка!

Кнігі я атрымаў тыя, якія я прасіў. Вельмі дзякую.

Адсылаю пару бялізны, дзьве пары шкарпэтак, хустачку, наўлачку, пляшку, шклянку, кастр[улю].

Калі ў дарогу, яшчэ невядома нічога. Пісаў проста, каб ты была гатова і да гэтага.

Ботаў ня трэба. З адзежы таксама пакуль што нічога ня трэба.

Прынясі ў наступны раз футарал на акуляры і рэдкі вялікі грэбень.